PolotskSU



# ГІСТОРЫЯ І КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ

## ГІСТОРЫЯ І КРАЯЗНАЎСТВА РЭГІЁНА І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ ДА 1917 г.

**УДК 9(476)+2(=411.16)**

## КАЗЁННЫЯ, ГРАМАДСКІЯ І ДУХОЎНЫЯ РАБІНЫ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТ.

***канд. гіст. навук К.Р. КАРПЕКІН***
**Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці**

*Артыкул прысвечаны параўнальнаму аналізу розныя катэгорыі іўдзейскіх рэлігійных служыцеляў: дзяржаўных (грамадскіх) і духоўных рабінаў. На прыкладзе Віцебскай губерні паказана, што, нягледзячы на падабенства, па сутнасці, іх функцый, дадзеныя інстытуты мелі значныя адрозненні, якія ўзніклі пад уплывам іх статусу, паколькі дзяржаўныя рабіны прызначаліся са згоды мясцовых уладаў, а духоўныя абіраліся абшчынай. Калі ў на працягу разглядаемага перыяду колькасць дзяржаўных рабінаў была больш-менш пастаяннай, лік духоўных рабінаў значна павялічылася. Устойлівасцю характарызаваўся таксама персанальны склад першай катэгорыі рабінаў. Для другой катэгорыі змяняльнасць кадраў, наадварот, была ўласціва ў большай ступені. Акрамя таго, асаблівым адрозненнем інстытута духоўных рабінаў з'яўлялася фарміраванне дынастый, сярод дзяржаўных рабінаў падобнага не выяўлена. У цэлым можна выказаць здагадку, што ў рэгіёне існаваў дэфіцыт апошніх, паколькі не ўсе дзяржаўныя рабіны валодалі неабходным адукацыйным цэнзам. Можна разглядаць як пэўны паказчык адрозненняў у становішчы двух катэгорый рабінаў асаблівасці афармлення іх пячатак. Яны маюць спрошчаны выгляд у дзяржаўных рабінаў, чым адрозніваюцца ад асабістых пячатак духоўных рабінаў.*

Адной са значных этнаканфесійных супольнасцяў, якія пражывалі на тэрыторыі Віцебскай губерні ў пачатку ХХ ст., з’яўляліся яўрэі, пераважная большасць якіх спавядала іўдаізм. Так, паводле вынікаў перапісу 1897 г., у межах згаданай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі налічвалася 89,7 тыс. іўдзеяў, а да 1909 г. іх колькасць узрасла да 97,1 тыс. [23, с. 27 – 28]. Для кантролю за дзейнасцю гэтай супольнасці ў Расійскай імперыі была створана адмысловая структура, якая ахоплівала як вышэйшыя дзяржаўныя органы ўлады, так і інстытуты мясцовага ўзроўню. Так, наглядам за ўсімі іўдзеямі імперыі ажыццяўляў Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў, які функцыянаваў у межах Міністэрства ўнутраных спраў. На тэрыторыі кожнай губерні за духоўныя справы былі адказныя адпаведныя губернскія праўленні.

PolotskSU

У сваю чаргу ўсе вернікі-іўдзеі аб'ядноўваліся ў абшчыны, кожная з якіх мела ўласнае духоўнае праўленне. Важныя функцыі меў рабін, які з'яўляўся кіраўніком іўдзейскай абшчыны і адначасова – службовай асобай, якая ажыццяўляла пасярэдніцтва паміж вернікамі і органамі ўлады.

Іншымі словамі, для іўдзейскай супольнасці рабін быў той асобай, якая знаходзілася на вяршыні абшчыннай іерархіі. З пазіцый жа органаў дзяржаўнай улады ён з'яўлялўся той асобай, праз якую магчыма было аказваць уплыў на вернікаў.

Праблема становішча рабінаў у беларуска-літоўскіх губернях у пачатку ХХ ст. дастаткова распрацавана ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі. У прыватнасці, даследаваны парадак абрання рабінаў у перыяд Расійскай імперыі [9, с. 170 – 171; 25, с. 80]. Вялікую цікавасць уяўляюць таксама біяграфічныя даследаванні, прысвечаныя асобным рабінам, праз лёс якіх магчыма прасачыць складанасць і неадназначнасць такога гістарычнага перыяду, як пачатак ХХ ст. [8].

Разам з тым, неасветленымі пытаннямі застаюцца такія, як дынаміка колькасці рабінаў, змяняемасць кадраў, пэўныя сацыяльныя характарыстыкі асоб, якія займалі гэтыя важныя пасады (у прыватнасці, такія, як узрост і адукацыя). Адказаць на пералічаныя пытанні магчыма, праанalізаваўшы звесткі пра казённых і духоўных рабінаў пэўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, таму мэта дадзенага даследавання – вывучэнне становішча казённых грамадскіх і духоўных рабінаў Віцебскай губерні ў пачатку ХХ ст.

Парадак абрання казённых рабінаў у Расійскай імперыі ў пачатку ХХ ст. вызначаўся “Статутам замежных веравызнанняў”, прынятым у 1896 г. Прэтэндэнт на пасаду павінен быў мець адпаведную адукацыю – скончыць рабінскае вучылішча альбо яўрэйскі настаўніцкі інстытут, альбо любую агульную вышэйшую ці сярэднюю навучальную ўстанову. У выпадку, калі абшчына была вельмі шматлікая, дазвалялася выбіраць памочніка рабіна (з разлікам – 1 памочнік на 1 тыс. вернікаў). Першапачаткова кожная іўдзейская грамада выбірала свайго ўпаўнаважанага, які потым удзельнічаў у выбарах рабіна. Удзельнічаць у выбарах упаўнаважанага мелі права вернікі мужчынскага полу, якія мелі расійскае падданства, не маладзейшыя за 25 гадоў і якія з'яўляліся сябрамі гэтай грамады не менш за 2 гады. Ад грамады, у якой налічвалася не больш за 100 сябраў, выбіралася 10 упаўнаважаных, калі ж грамада мела больш за 100 асоб, то звыш гэтай лічбы на кожных 100 выбаршчыкаў абіраўся 1 упаўнаважаны. Казённы рабін выбіраўся тэрмінам на 3 гады. Пасля выбараў ён зацвярджаўся губернскім праўленнем і атрымліваў ад яго адмысловае пасведчанне. Затым ён заключаў дамову з абшчынай, у якой агаворваліся памеры яго жалавання, аплата абрадаў і да т.п. У выпадку, калі абшчына была зусім малалікай і не магла ўтрымліваць асобнага рабіна, яна мела права далучыцца да абшчыны бліжэйшага населенага пункта. Паводле “Статута” 1896 г., рабін абавязаны быў сачыць за выкананнем вернікамі рэлігійных абрадаў, тлумачыць ім пытанні веры, назіраць за маральным станам абшчыны і выкананнем законаў імперыі, здзяйсняць абрады абразання, надання імя, заключэння і растаржэння шлюбу, пахавання, весці адпаведныя метрычныя запісы [24, с. 126].

PolotskSU



Тым не менш, нярэдка вернікі не лічылі казённых рабінаў дастаткова кампетэнтнымі ў пытаннях веры. І паступова ў асяроддзі іўдзейскіх абшчын Расійскай імперыі склалася сітуацыя, калі акрамя казённага абіраўся яшчэ і духоўны рабін. Фармальна ён займаў пасаду вучонага ў складзе духоўнага праўлення, таму такое становішча не парушала ніякіх заканадаўчых норм. Духоўны рабін не зацвярджаўся губернскімі ўладамі, але ў сваёй дзейнасці ён павінен быў цалкам падпарадкоўвацца казённаму рабіну. Такое становішча было вельмі распаўсюджаным і ў пачатку XX ст. [10, с. 31].

Што тычыцца казённых і грамадскіх рабінаў, то на працягу даследуемага перыяду іх лік у межах губерні вагаўся ад 11 да 15 (гл. табл. 1). У губернскім цэнтры рабін знаходзіўся ў абавязковым парадку, у 1900 – 1903 гг. пры ім таксама меўся памочнік. Але пачынаючы з 1904 г. памочнікі, як правіла, накіроўваліся ў іншыя гарады ці мястэчкі. У цэлым стабільная сітуацыя назіралася ў павятовых цэнтрах: па аднаму казённаму рабіну было ў Дзвінску, Дрысе, Лепелі, Люцыне, Невелі, Полацку і Рэжыцы, у Веліжы і Себежы ў некаторыя гады гэта пасада была вакантнай. Што да Гарадка, то тут абшчыну ўзначальваў памочнік віцебскага казённага рабіна, але з перыядычнымі перапынкамі. Пасля 1905 г. казённыя рабіны абіраліся ў пазаштатным горадзе Суражы і асобных мястэчках губерні. Але пастаянна кіраваў абшчынай, па сутнасці, толькі памочнік віцебскага рабіна ў Суражы, а ў астатніх населеных пунктах рабіны з’яўляліся эпізадычна.

Табліца 1. – Казённыя і грамадскія рабіны Віцебскай губерні, пачатак XX ст.

| Прозвішча, імя, імя па бацьку | Месца службы | Час займання пасады, г. | Біяграфічныя звесткі |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Багарад Элья Янкелевіч | г. Дзвінск | 1912. | Выконваючы абавязкі казённага рабіна |
| Баравік Ісідор (Ісай) Лейзеравіч | г. Люцын | 1900 – 1914 | Скончыў Шавельскую гімназію, Віленскі яўрэйскі настаўніцкі інстытут |
| Бідэрман Мортхель Іцыкавіч | г. Рэжыца | 1912 | Выконваючы абавязкі казённага рабіна |
| Блехар Ізраіль Аронавіч | м. Янавічы | 1908 – 1910 | Выконваючы абавязкі рабіна, скончыў павятовае вучылішча, меў званне таксатара |
| Блехман Залман | м. Бачэйкава | 1910 | Памочнік віцебскага рабіна |
| Брук Гірша Якаўлевіч | г. Віцебск | 1902 – 1905 | Нарадзіўся ў 1869 г., скончыў медыцынскі факультэт Кіеўскага ўніверсітэта св. Уладзіміра |
| Бухбіндэр Бенцыян Шмуйлавіч | г. Гарадок | 1910 – 1914 | Памочнік віцебскага казённага рабіна, скончыў Віцебскае павятовае вучылішча |
| Воласаў Бер Пінхусавіч | г. Лепель | 1900 – 1914 | Скончыў Віцебскае казённае яўрэйскае вучылішча 2-га разраду |
| Гінзбург Моўша Ліпкавіч | м. Коханавічы | 1912 | |
| Гінзбург Янкель Ізраілевіч | м. Нікалаева | 1912 | Памочнік віцебскага казённага рабіна |

PolotskSU



Заканчэнне табліцы 1

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| Гітэльсон Бер Абрамавіч | г. Віцебск | 1900 – 1901 | Скончыў рабінскае вучылішча |
| Давідаў Давід-Мота (Давід-Мордух) Залманавіч | г. Себеж | 1908, 1914 | Выконваючы абавязкі казённага рабіна |
| Дворкін Герцаль Борухавіч | г. Веліж | 1912 | Выконваючы абавязкі казённага рабіна |
| Каган Мордух | м. Ула | 1910 | Памочнік віцебскага рабіна |
| Крамнік (Крашнік) Мірон Герасімавіч | г. Полацк | 1900 – 1914 | Скончыў Віленскае рабінскае вучылішча |
| Лабкоўскі Гілель Абрамавіч | г. Сураж | 1908 | Памочнік віцебскага рабіна, скончыў павятовае вучылішча |
| Лерман Ізраіль-Янкель Гіршавіч | м. Бешанковічы | 1914 | |
| Лур'е Сімон Ошар-Беркавіч | г. Себеж | 1912 | |
| Меерзон Ісак Ёселевіч | г. Веліж | 1900 – 1910 | Скончыў Велікалуцкае рэальнае вучылішча |
| Меламед Іосіф Абрамавіч | г. Віцебск | 1912 – 1914 | Нарадзіўся ў 1859 г. |
| Мінскер Самуіл Мануілавіч | г. Дрыса | 1914 | |
| Нейстат (Нейштат) Іцык Залманавіч | г. Гарадок | 1904 – 1908 | Памочнік віцебскага казённага рабіна |
| Нейштадт Элья Беркавіч | г. Невель | 1900 – 1914 | Скончыў Велікалуцкае рэальнае вучылішча |
| Перльштэйн Абрам Ельевіч | г. Віцебск | 1900 – 1903, 1912 | Скончыў 6 класаў Віцебскай гімназіі, памочнік віцебскага рабіна |
| | | 1908 – 1910 | Выконваючы абавязкі віцебскага казённага рабіна |
| Поляк Якаў Маісеевіч | г. Рэжыца | 1900 – 1910, 1914 | Скончыў Віленскі яўрэйскі настаўніцкі інстытут |
| Ратнер Гірша Давідавіч | г. Дзвінск | 1900 – 1914 | Скончыў Віленскае рэальнае вучылішча |
| Ратнер Ісак Ізраілевіч | г. Себеж | 1901 – 1905 | Скончыў Юр'еўскі ўніверсітэт |
| Соскін Шмуйла Лейзеравіч | г. Дрыса | 1912 | Выконваючы абавязкі казённага рабіна |
| Стэрнін Берка Іцкавіч | г. Сураж | 1909 – 1910 | Атрымаў хатнюю адукацыю, памочнік віцебскага рабіна |
| Хазанаў Мордух Вульфавіч | г. Гарадок | 1900 | Скончыў прыватнае яўрэйскае вучылішча, памочнік віцебскага рабіна |
| Шлемінзон Елья-Міхель Вульфавіч | г. Дрыса | 1908 – 1910 | Скончыў Юр'еўскі ўніверсітэт |
| Юдзялевіч Маісей Лазаравіч | г. Дрыса | 1900 – 1905 | Скончыў Харкаўскі ўніверсітэт, урач. |

Заўвага – Табліца складзена аўтарам паводле [12, с. 79 – 80; 13, с. 72 – 73; 14, с. 51 – 52; 15, с. 50 – 51; 16, с. 50; 17, с. 50; 18, с. 49 – 50; 19, с. 52 – 54; 20, с. 52 – 54; 21, с. 253 – 255; 22, с. LXVII – LXX].

PolotskSU



Колькасць духоўных рабінаў у Віцебскай губерні ў пачатку XX ст. наадварот рэзка павялічвалася (гл. табл. 2). Калі ў 1900 – 1908 гг. іх лік быў зусім нязначным (у межах 5 – 11 асоб), то пачынаючы з 1909 г., духоўных рабінаў сталі выбіраць многія іўдзейскія абшчыны Віцебшчыны. У прыватнасці, у 1909 г. на тэрыторыі губерні іх налічвалася 29, у 1910 г. – 37, у 1912 г. – 36, у 1914 г. – 42. Як правіла, у адным населеным пункце быў 1 ці 2 духоўныя рабіны, выключэнне ўяўлялі толькі Віцебск і Дзвінск, дзе ў 1914 г. вернікі абралі 3 і 4 рабіны адпаведна.

Выпадкі спалучэння пасады казённага і духоўнага рабіна былі вельмі рэдкімі. У межах Віцебскай губерні ў пачатку XX ст. зафіксаваны толькі адзін такі выпадак: у 1909 – 1910 гг. і казённым грамадскім і адначасова духоўным рабінам у Суражы з'яўляўся Б.І. Стэрнін [19, с. 52; 20, с. 52].

Табліца 2. – Духоўныя рабіны Віцебскай губерні, пачатак XX ст.

| Прозвішча, імя, імя па бацьку | Месца службы | Час займання пасады, г. | Біяграфічныя звесткі |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Багацін Ёсель Янкелевіч | г. Лепель | 1914 | Нарадзіўся ў 1881 г. |
| Барэнбаўм Мендаль Абрамавіч | м. Юхавічы | 1912 | |
| Берхін Урый Беркавіч | м. Ільіно | 1900 | |
| Блох Шэвель Модухавіч (Залманавіч) | м. Кублічы | 1909 – 1914 | |
| Браўдэ Рувім Хаімавіч | г. Себеж | 1908 | |
| Брутман-Брэйтман (Бройтман) Лейба Гешэлевіч (Брутманавіч) | м. Сіроціна | 1910 – 1914 | Нарадзіўся ў 1861 г. |
| Вайран Янкель Абрамавіч | с. Карсоўка | 1912 – 1914 | |
| Вайсборд Абрам-Файвіш Мееравіч | м. Прэлі | 1909 – 1910 | |
| Гельман Берка Хаім-Моўшавіч | м. Янавічы | 1914 | Нарадзіўся ў 1883 г. |
| Генелін Алтэр-Ізраіль Аронавіч | г. Полацк | 1909 – 1910 | |
| Гільбербнат (Гільбельбранд, Гільбербрандт) Моўша Гірша-Давідавіч | м. Крэйцбург | 1909 – 1912 | |
| Гільдзінсон Абрам(-Ізраіль) Аронавіч | м. Бешанковічы | 1909 – 1914 | |
| Гінзбург Моўша Ліпавіч | м. Коханавічы | 1909 – 1910, 1914 | Атрымаў хатнюю адукацыю. |
| Гіршмовіч Янкель | м. Дагда | 1912 | |
| Гурэвіч Мордух (Мордха-Бер) Зусьевіч | г. Віцебск | 1912 – 1914 | Нарадзіўся ў 1884 г. |
| Давідсон Евель Файвішавіч | м. Усвят | 1901 – 1902 | |

PolotskSU



Працяг табліцы 2

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| Даніях Лейба Хаімавіч | г. Дрыса | 1914 | |
| Даніях Хаім Шэпшэлевіч | г. Дрыса | 1909 – 1912 | Атрымаў хатнюю адукацыю |
| Даніяхін Шлёма Хаімавіч | м. Ула | 1909 – 1910 | |
| Дуніях (Дуніяхін) Моўша Шлёмавіч | м. Ула | 1912 – 1914 | |
| Донхін Лейзер Шэпшэлевіч | г. Люцын | 1910 – 1914 | |
| Дрозд Шлёма Хаімавіч | г. Себеж | 1904 | |
| Дусовіч Ізраіль | г. Рэжыца | 1908 – 1910 | |
| Зэлікман Берка Міхелевіч | м. Глазманка | 1909 – 1912 | |
| Зэльдзін Залман-Бер Хаімавіч | г. Дзвінск | 1914 | |
| Ісьемін Ізраіль Міхелевіч (Давідавіч) | м. Асвея | 1909 – 1914 | Атрымаў хатнюю адукацыю |
| Кац-Каган Меер-Сімх Шымшэлевіч | г. Дзвінск | 1914 | |
| Клібанаў Хаім-Янкель Сімонавіч | м. Чашнікі | 1914 | Нарадзіўся ў 1856 г. |
| Кляцкін Ісер Герцавіч | м. Лівенгоф | 1909 – 1912 | |
| Лабанаў Абрам-Хаім Рувінавіч | м. Бабынічы | 1912 – 1914 | |
| Левін Калман Абрамавіч | г. Дзвінск | 1904 – 1905 | |
| Левін Мендаль-Лейба Нохімавіч (Шаевіч) | м. Гомель | 1910 – 1912 | |
| Лейн Ешай (Аўсей) (Хаім)-Давідавіч | м. Бешанковічы | 1912 – 1914 | |
| Лур’е Абрам Зэлікавіч | м. Краслаўка | 1910 – 1914 | |
| Лур’е Давід-Шлёма Залманавіч | г. Лепель | 1908 | |
| Лявіеў Абрам(-Лейба) Мордухавіч | г. Невель | 1900 – 1914 | |
| Медалье Шмераль-Лейба Янкелевіч | г. Віцебск | 1910 – 1914 | Нарадзіўся ў 1872 г. |
| Неймарк Ёсель Залманавіч (Файвішавіч) | г. Невель | 1900 – 1904, 1909 – 1914 | |
| Новік Ізроіль Беркавіч | м. Ушач | 1909 – 1914 | |
| Ноя (Ноэ) Гірша Ёселевіч | м. Калышкі | 1904 – 1914 | Атрымаў хатнюю адукацыю |
| Нямойцін Аўсей Ёселевіч | м. Бешанковічы | 1909 – 1910 | |
| | г. Веліж | 1912 – 1914 | |
| Ольшванг Гірша Нохімавіч | м. Прыдруйск | 1912 | |
| Пауль Арон-Цалель Рафаілавіч | п. Розенаўскі | 1912 – 1914 | |
| Перавознікаў Мендаль Нохімавіч | м. Росіца | 1912 – 1914 | |
| Пераль Лейба | г. Рэжыца | 1908 – 1910 | |
| Пупко Лейзер Хаімавіч | г. Веліж | 1912 – 1914 | |
| Рабіновіч Вульф Залманавіч (Іцкавіч) | г. Лепель | 1908 – 1910, 1914 | Нарадзіўся ў 1871 г. |

PolotskSU



Заканчэнне табліцы 2

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| Равінсон Ёсель | м. Краслаўка | 1910 – 1914 | |
| Разенкноп Левік (Лейба-Іцык) Беркавіч | г. Себеж | 1904 – 1908 | |
| Райнін Абрам-Бер Сімонавіч | г. Веліж | 1909 – 1910 | |
| Раяк Мендаль Донавіч | г. Дзвінск | 1914 | |
| Розін Іосіф Фішэлевіч | г. Дзвінск | 1914 | Нарадзіўся ў 1858 г. |
| Рудэльсон Еханон Хаімавіч-Сімонавіч (Ейханен Сімонавіч) | г. Веліж | 1900 | |
| | м. Ільіно | 1901 – 1914 | |
| Рудэльсон Ёсель Хаімавіч | м. Сіроціна | 1910 | |
| | ст. Шуміліна | 1912 – 1914 | |
| Рыўлін Мендаль Ёселевіч | м. Бабынічы | 1909 | Скончыў гарадское вучылішча |
| Рэзнік Моўша Абрамавіч | м. Арэхаўна | 1914 | |
| Смаргон Янкель Гіршавіч | м. Дагда | 1909 – 1910, 1914 | Скончыў Брэсцкае рабінскае духоўнае вучылішча |
| Соскінд Меер Нохімавіч | м. Бачэйкава | 1912 – 1914 | |
| Стэрнін Берка Іцкавіч | г. Сураж | 1908 – 1910 | Атрымаў хатнюю адукацыю, памочнік віцебскага казённага рабіна |
| Тумаркін Арон Беніямінавіч | м. Бабынічы | 1910 | |
| Фендэх (Фендэль) Лейзер Моўшавіч | м. Дагда | 1909 – 1914 | Скончыў рабінскае вучылішча ў м. Ляды |
| Фрадкін Ізраіль-Сімон Залманавіч | м. Камень | 1909 – 1914 | |
| Хейфец Элья Хацкелевіч | м. Валынцы | 1912 – 1914 | |
| Херузэ Мордух-Берка Шаевіч (гл. мал. 1) | м. Бачэйкава | 1909 – 1910 | Нарадзіўся ў 1855 г. у г. Іерусаліме, у 1880 г. прыбыў у Расійскую імперыю |
| Цыён Іцык Нафталіевіч | г. Рэжыца | 1900 | |
| Шварцман Беніамін-Мендаль Завелевіч | м. Чашнікі | 1914 | |
| Шнеерсон Іосіф Лейбавіч | г. Віцебск | 1914 | |
| Шнеерсон Лейба Шнееравіч (Шмеркавіч) | г. Веліж | 1900 – 1910 | |
| Штам Шолам-Эльяш Зусьманавіч | г. Гарадок | 1910, 1914 | |
| Шэйнін (Шэйнкін) Зіська (Залман-Зісель) Гіршавіч | г. Веліж | 1901 – 1905 | |
| | м. Чашнікі | 1909 – 1912 | |

Заўвага – Табліца скаладзена аўтарам паводле [1, арк. 7 адв., 95; 2, арк. 68, 71; 3, арк. 134, 181; 6, арк. 380, 531, 951 адв.; 12, с. 79 – 80; 13, с. 72 – 73; 14, с. 51 – 52; 15, с. 50 – 51; 16, с. 50; 17, с. 50; 18, с. 49 – 50; 19, с. 52 – 54; 20, с. 52 – 54; 21, с. 253 – 255; 22, с. LXVII – LXX].

Нягледзячы на тое, што тэрмін паўнамоцтваў рабінаў працягваўся 3 гады, нярэдка здаралася так, што пасля выбараў пасаду працягвала займаць тая ж асоба. Да прыкладу,

PolotskSU



на працягу 1900 – 1914 гг. нязменна казённымі грамадскімі рабінамі з’яўляліся 5 асоб (гл. табл. 1). З улікам таго, што ў 1900 г. у Віцебскай губерні налічвалася 11 рабінаў разам з памочнікамі, гэта складае 45% агульнага ліку.



Малюнак 1. – Херузэ Мордух-Берка Шаевіч, 1920 г. [2, арк. 69]

У асяроддзі духоўных рабінаў змяняемасць кадраў была больш частай з’явай. З усіх асоб нязменна займаў сваю пасаду ў 1900 – 1914 гг. толькі 1 рабін (гл. табл. 2). Калі ж улічыць, што масава духоўныя рабіны пачалі выбірацца з 1909 г., то ўсё роўна ў параўнанні з казённымі рабінамі ратацыя адбывалася вельмі актыўна: у 1909 – 1914 гг. безупынна займалі свае пасады толькі 8 чалавек (каля 30%, паводле стану на 1909 г.). Часам духоўныя рабіны перасяляліся ў іншыя населеныя пункты і на новым месцы жыхарства іх зноў абіралі на такую ж пасаду. Але такія перасяленні былі досыць рэдкімі (усяго зафіксавана 3 выпадкі), прычым яны маглі ажыццяўляцца як на нязначныя адлегласці (у прыватнасці, з Сіроціна ў Шуміліна), так і ў іншыя паветы (з Бешанковічаў у Веліж і з Веліжа ў Чашнікі). Таксама можна меркаваць, што ў некаторых мястэчках Віцебскай губерні ў асяроддзі духоўных рабінаў складваліся дынастыі, калі пасля бацькі пасаду займаў сын. Такія высновы можна зрабіць, параўноўваючы імёны і імёны па бацьку асоб, якія мелі аднолькавыя прозвішчы і пражывалі ў адным і тым жа населеным пункце. У прыватнасці, падобная пераемнасць існавала ў Дрысе і Уле.

Як адзначалася вышэй, для заняцця пасады казённага рабіна патрабаваўся пэўны адукацыйны цэнз. На аснове выяўленых біяграфічных звестак можна з упэўненасцю сцвярджаць, што неабходную адукацыю дакладна мела не менш як палова рабінаў. Але адначасова неабходна звярнуць увагу на той факт, што здараліся адзінкавыя выпадкі, калі казённыя рабіны мелі толькі хатнюю адукацыю (гл. табл. 1). У асяроддзі духоўных

PolotskSU



рабінаў назіралася адваротная сітуацыя: пераважная іх большасць не заканчвала ніякіх навучальных устаноў, але некаторыя ў свой час навучаліся ў гарадскіх ці рабінскіх вучылішчах (гл. табл. 2).

Казённыя, грамадскія, як і духоўныя рабіны, маглі займаць пасаду ў любым узросце: як у маладым, так і ў дастаткова сталым. У прыватнасці, у пачатку ХХ ст. дзейнасцю іўдзейскіх абшчын Віцебшчыны кіравалі як асобы маладзейшыя за 30 гадоў, так і старэйшыя за 70, прычым асноўная маса мела ўзрост ад 30 да 60 гадоў (гл. табл. 1 – 2).

Паколькі рабіны з'яўляліся службовымі асобамі, яны мелі ўласныя пячаткі, якімі завяралі дакументы для надання ім юрыдычнай моцы: лісты, хадайніцтвы, выпіскі з метрычных кніг і да т.п. Пячаткі віцебскіх казённых і грамадскіх рабінаў былі простымі ў афармленні: у круглым полі змяшчалася рускамоўная легенда, якая сведчыла пра пасаду яе ўладальніка, а таксама магла прысутнічаць выява герба Расійскай імперыі (гл. мал. 2, 3). У адрозненне ад іх пячаткі памочнікаў віцебскага грамадскага рабіна мелі надпісы пра імя асобы, якая займала дадзеную пасаду і месца службы (гл. мал. 4). Пячаткі духоўных рабінаў былі больш складанымі паводле свайго афармлення. Яны маглі быць не толькі круглымі па форме, але таксама авальнымі, прамавугольнымі ці ўвогуле не мець акрэсленых межаў. Яны абавязкова былі персанальнымі: утрымлівалі звесткі пра імя рабіна і месца размяшчэння абшчыны, якую ён узначальваў. Легенда, як правіла, была двухмоўнай: у верхняй частцы адбітка – на іўрыце, а ў ніжняй – па-руску, але часам выраблялíся толькі іўрытамоўныя пячаткі (гл. мал. 5 – 7). Неабходна адзначыць, што гэтымі ж пячаткамі рабіны працягвалі карыстацца і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.




Малюнак 2. – Пячатка віцебскага грамадскага рабіна, 1919 г. [5, арк. 24]



Малюнак 3. – Пячатка віцебскага казённага і грамадскага рабіна, 1901 г. [11, арк. 4 адв.]




Малюнак 4. – Пячатка памочніка віцебскага грамадскага рабіна ў Суражы І.Б. Стэрніна, 1913 г. [5, арк. 4 адв.]

Такім чынам, на прыкладзе Віцебскай губерні бачна, што ў пачатку ХХ ст. суіснавалі два інстытуты рабінства: казённыя (грамадскія) і духоўныя. І хоць функцыі ў іх, па сутнасці, былі аднолькавымі, самі яны мелі значныя адрозненні, што вынікала з іх статусу, бо казённыя рабіны прызначаліся са згоды мясцовых улад, а духоўныя абіраліся абшчынай. Калі на працягу даследуемага перыяду колькасць казённых рабінаў была

PolotskSU



больш-менш пастаяннай, то лік духоўных рабінаў значна павялічыўся. Большай стабільнасцю характарызаваўся і персанальны склад першай катэгорыі рабінаў. Для духоўных жа, наадварот, у большай ступені была ўласціва змяняемасць кадраў. Апроч таго, асаблівай рысай інстытута духоўных рабінаў з'яўлялася фарміраванне дынастый, у асяроддзі казённых рабінаў такіх фактаў не выяўлена. Увогуле, можна меркаваць, што ў рэгіёне адчуваўся недахоп апошніх, бо не ўсе казённыя рабіны мелі неабходны адукацыйны цэнз. Пэўным паказчыкам рознага становішча дзвюх катэгорых рэлігійных служыцеляў можна лічыць і розныя падыходы да афармлення іх пячатак. Іх спрошчаны выгляд у казённых рабінаў яўна адрозніваецца ад персанальных пячатак духоўных рабінаў.




Малюнак 5. – Пячатка духоўнага рабіна м. Кублічы Ш. Блоха, 1922 г. [4, арк. 135],




Малюнак 6. – Пячатка віцебскага духоўнага рабіна Ш.-Л.Я. Медалье, 1927 г. [7, арк. 11]



Малюнак 7. – Пячатка віцебскага духоўнага рабіна М.З. Гурэвіча, 1927 г. [7, арк. 11]

ЛІТАРАТУРА

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 56. Воп. 6. Спр. 96.
2. ДАВВ. – Ф. 56. Воп. 7. Спр. 6.
3. ДАВВ. – Ф. 118. Воп. 4. Спр. 43.
4. ДАВВ. – Ф. 260. Воп. 1. Спр. 55.
5. ДАВВ. – Ф. 1001. Воп. 1. Спр. 91.
6. ДАВВ. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 193.
7. ДАВВ. – Ф. 10073-п. Воп. 1. Спр. 180.
8. Династия Медалье : сборник статей / И. Васильев [и др.]. – М. : Арт Гид, 2014. – 120 с.
9. Канфесійны фактар у сацыяльным жыцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В.В. Яноўская [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 496 с.
10. Краткая еврейская энциклопедия : в 11 т. / Общество по исследованию еврейских общин, Еврейский университет в Иерусалиме ; гл. ред.: И. Орен (Надель), Н. Прат. – Иерусалим, 1976–2005. – Т. 7. – 1994. – 1034 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1416. Воп. 2. Спр. 20147.
12. Памятная книжка Витебской губернии на 1900 год. – Витебск : Губернская типо-литография, 1900. – VII, 36, 243, 157, [2] с.
13. Памятная книжка Витебской губернии на 1901 год. – Витебск : Губернская типолитография, 1900. – VII, 39, 244, 140 с.

PolotskSU



14. Памятная книжка Витебской губернии на 1902 год. – Витебск : Губернская типолитография, 1901. – VI, 32, 216, 90 с.
15. Памятная книжка Витебской губернии на 1903 год. – Витебск : Губернская типолитография, 1902. – VII, 32, 226, 110, 96 с.
16. Памятная книжка Витебской губернии на 1904 год. – Витебск : Губернская типолитография, 1903. – VIII, 32, 255, 119, 19 с.
17. Памятная книжка Витебской губернии на 1905 год. – Витебск : Губернская типолитография, 1904. – VII, 34, 263, 152, 8, 12, [27] с.
18. Памятная книжка Витебской губернии на 1908 год. – Витебск : Губернская типография, 1908. – IX, 28, 359, 137, 26, [16] с.
19. Памятная книжка Витебской губернии на 1909 год. – Витебск : Губернская типография, 1909. – VIII, 28, 425, 152 с.
20. Памятная книжка Витебской губернии на 1910 год. – Витебск : Губернская типография, [1910]. – VIII, 27, 445, 168 с.
21. Памятная книжка Витебской губернии на 1912 год. – Витебск : Губернская типография, 1912. – [2], IX, 153, 332, [4] с.
22. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год. – Витебск : Губернская типография, 1914. – VIII, 280, LXX, 42 с.
23. Розенблат, Е. Динамика численности и расселения белорусских евреев в XX веке / Е. Розенблат, И. Еленская // Диаспоры. – 2002. – № 4.
24. Свод Законов Российской Империи издания 1896 года. – СПб, 1896. – Т. XI, Ч. I.
25. Смиловицкий, Л. Евреи в Турове: история местечка Мозырского Полесья / Л. Смиловицкий. – Иерусалим : Tsar-Ot Press, 2008. – 799 с.

## STATE, PUBLIC AND SPIRITUAL RABBIS OF VITEBSK PROVINCE IN BEGINNING XX CENTURY

*K. KARPEKIN*

*Article is devoted the comparative analysis of various categories of Judaic religious attendants: state (public) and spiritual rabbis. On an example of Vitebsk province it is visible that despite presence, as a matter of fact, similar functions, institutes had considerable differences which were generated under the influence of their status as state rabbis were appointed with the consent of local authorities, and spiritual were selected a community. If throughout the investigated period the quantity of state rabbis was more or less constant number of spiritual rabbis has considerably increased. Stability characterised also personal structure of the first category of rabbis. For spiritual removability of shots, on the contrary, was in a greater degree peculiar. Besides, special line of institute of spiritual rabbis was formation of dynasties, among state rabbis of such facts is not revealed. As a whole, it is possible to assume that in region there was a shortage of the last as not all state rabbis had the necessary educational qualification. It is possible to consider as some indicator of various position of two categories of religious attendants and different lines of thought to registration of their seals. Their simplified kind at state rabbis obviously differs from the personal seals of spiritual rabbis.*